


# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

## НА 2022 ГОД

Падпіска на выданні ажыццяўляецца на дагаворнай аснове.

## Заказ выданняў:

Заказ на выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адсылайце на e-mail: nbb-izdat@mail.ru; edit@nlb.by або на адрас:

*Выдавецкі аддзел,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*пр. Незалежнасці, 116,*
*220114, г. Мінск.*

Калі падпіску за бібліятэку аплачвае аддзел культуры выканкама, то дагавор павінен заключацца **паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і аддзелам культуры выканкама.**

Па пытаннях аплаты выданняў звяртайцеся па тэл.: (+375 17) 293 25 76, 293 28 40.

## Набыць выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі магчыма:

Нацыянальная бібліятэка Беларусі
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск
Тэл. (+375 17) 293 28 21
Факс (+375 17) 266 37 23

У кіёску Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (за наяўны разлік)
Тэл. (+375 17) 293 28 52

РУП «Акадэмічная кніга»
Пр. Незалежнасці, 72, 220012, г. Мінск
Тэл./факс: (+375 17) 292 00 52, 292 46 52, 292 50 43

# ЗМЕСТ

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ 4

ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ 9

КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
выхаду ў свет інфармацыйных выданняў
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2022 г. 11

# Друкаваныя выданні

## 1. Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 14

*Адказны за выпуск Кірухіна Л.Г.*




Чарговы выпуск навуковага зборніка прысвечаны пытанням фарміравання сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай прасторы, перспектывам развіцця бібліятэк.

Прызначаны спецыялістам у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій, выкладчыкам, аспірантам і магістрантам, кіраўнікам органаў упраўлення культуры.

## 2. Бібліятэчны свет: часопіс*

*Галоўны рэдактар Кірухіна Л.Г.*




Часопіс, заснавальнікамі якога з'яўляюцца Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, выдаецца з мэтай навукова-практычнага і навукова-метадычнага забеспячэння бібліятэчнай справы, а таксама раскрыцця творчага і навуковага патэнцыялу спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій.

Прадстаўляе інтарэс для тых, хто вывучае бібліятэчную справу, гісторыю, краязнаўства і культуру Беларусі.

---

* Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74895 (інд.), 748952 (вед.).

## 3. Гісторыя беларускай нацыянальнай бібліяграфіі. 1921–2021 гг.

*Адказны за выпуск Кузьмініч Т.В.*




Выданне прысвечана беларускай нацыянальнай бібліяграфіі – важнейшаму складніку інфармацыйнай інфраструктуры грамадства. Паказана спецыфіка бібліяграфічных ведаў, стварэнне якіх яна забяспечвае, яе крыніцазнаўчы характар у дачыненні да некаторых галіновых кірункаў бібліяграфіі, асабліва гістарычнай, і значымасць для гістарычных даследаванняў. Засяроджана ўвага на гісторыі беларускай нацыянальнай бібліяграфіі ў апошняе стагоддзе – час станаўлення яе самых уплывовых арганізацыйных структур і фарміравання асноўнага рэсурснага складніка. Праілюстравана абумоўленасць развіцця айчыннай нацыянальнай бібліяграфіі сацыякультурным асяроддзем, тэндэнцыямі, уласцівымі для гэтага віду бібліяграфічнай дзейнасці на рэгіянальным і сусветным узроўнях, яе роля ў інфармацыйным забеспячэнні беларускага грамадства на кожным з выдзеленых гістарычных этапаў. Прааналізавана паэтапнае фарміраванне нарматыўнай базы і стварэнне асобных арганізацыйных структур, фарміраванне рэсурсаў беларускай нацыянальнай бібліяграфіі, а таксама эвалюцыя метадычных падыходаў, характэрных для адпаведнай бібліяграфічнай прадукцыі. Вызначаны перспектывы яе развіцця як асноўнай сістэмы сучаснай айчыннай бібліяграфіі.

## 4. Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 25

*Адказны за выпуск Суша А.А.*




Чарговы выпуск навуковага зборніка будзе прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У ім будуць адлюстраваны матэрыялы па праблемах вывучэння, захоўвання і выкарыстання дакументальнай спадчыны Беларусі, гісторыі рукапіснай і друкаванай кнігі, архіўных дакументаў, бібліятэчнай справы, бібліяграфазнаўства, культуралогіі, падрыхтаваных беларускімі і замежнымі даследчыкамі кніжнай культуры. Зборнік артыкулаў з’яўляецца навуковым выданнем, якое рэцэнзуецца і ўключана ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі. Матэрыялы зборніка ўводзяць у навуковы ўжытак унікальныя дакументальныя помнікі, новыя дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кнігі і культуры Беларусі, і будуць карыснымі ўсім, хто цікавіцца нашай спадчынай.

## 5. Материалы IX Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры». Тема: «100 лет Национальной библиотеке Беларуси»

*Ответственный за выпуск Есис Н.С.*




Сборник содержит материалы Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры», который который проводит Национальная библиотека Беларуси. Публикуются доклады известных специалистов крупнейших библиотек, научно-исследовательских учреждений, представителей других организаций Беларуси и зарубежных стран, посвященные актуальным вопросам развития библиотечного дела.

Материалы публикуются в авторской редакции.

Структура издания традиционно формируется в соответствии с программой конгресса.

## 6. Матэрыялы XVIII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў

*Адказны за выпуск Карнілава Т.У.*




Зборнік будзе складацца з матэрыялаў XVIII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, якія пройдуць у красавіку 2022 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Артыкулы будуць прысвечаны гісторыі кніжнай культуры, падыходам да захавання, вывучэння і папулярызацыі дакументальнай спадчыны, прадэманструюць унікальнасць беларускай кніжнай культуры і агульнасць культурнай спадчыны Беларусі і іншых краін.

Зборнік складаецца з матэрыялаў XVIII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, якія ладзяцца ў красавіку.

## 7. Новыя кнігі: па старонках беларускага друку**

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*




Штомесячны ўніверсальны бібліяграфічны бюлетэнь інфармуе пра новыя кнігі беларускіх выдавецтваў, найбольш значныя артыкулы з рэспубліканскай перыёдыкі, а таксама рэцэнзіі на беларускія выданні.

У якасці дадаткаў друкуюцца біяграфічныя спісы або агляды, прысвечаныя значным гістарычным падзеям і актуальным пытанням сучаснага развіцця Беларусі, “Беларускі каляндар, … год”, а таксама матэрыялы да юбілеяў выдатных дзеячаў краіны, шэрагу арганізацый і ўстаноў, што складаюць аснову эканомікі, культуры, навукі і асветы Беларусі.

** Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74972 (інд.), 749722 (вед.).

Прызначаны ў дапамогу прафесійнай дзейнасці работнікаў бібліятэк, іншых культурных і асветных устаноў, а таксама студэнтам, навучэнцам і ўсім неабыякавым да гісторыі, культуры і сучаснага жыцця сваёй краіны, тым, хто адчувае неабходнасць аператыўна атрымліваць патрэбную інфармацыю для павышэння агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі і арганізацыі вольнага часу.

Тэмы дадаткаў на 2022 г.:

№ 1. Мастацкая літаратура (бібліяграфічны спіс).
№ 2. Даты беларускага календара (сакавік – май).
№ 3. Даты беларускага календара (чэрвень – жнівень).
№ 4. Кірмашы у Беларусі.
№ 5. Даты беларускага календара (верасень – кастрычнік).
№ 6. Кнігі – дзецям (бібліяграфічны спіс).
№ 7. З гісторыі беларускага тэатра (ад вытокаў да пачатку XX ст.).
№ 8. Беларускі каляндар, 2023 год.
№ 9. Даты беларускага календара (лістапад – снежань).
№ 10. Беларусь у сусветным друку (бібліяграфічны спіс).
№ 11. Всемирный календарь, 2023 год.
№ 12. Даты беларускага календара (студзень – люты 2023 года).

# Электронныя выданні

## 8. Белорусы на целинных землях Казахстана: 1954 г. – середина 1960-х гг.

*Ответственный за выпуск Кулинок С. В.*




Электронный сборник документов и материалов рассказывает о переселении белорусов в Казахскую ССР в 1954 г. – середине 1960-х гг. В издание включены 187 документов, в том числе из Национального архива Республики Беларусь, Государственного архива Минской области, архива Президента Республики Казахстан, Государственного архива Восточно-Казахстанской области, Государственного архива Костанайской области, Лисаковского регионального государственного архива. Среди опубликованных документов постановления, распоряжения, протоколы и выписки из протоколов, докладные записки, справки, письма, воспоминания и др.

Документы систематизированы по тематическому и хронологическому принципам.

Электронное издание состоит из четырех разделов. Первый содержит документы центральных и республиканских партийно-советских органов о ходе освоения целинных и залежных земель; второй – материалы об организации и отборе кадров переселенцев; третий рассказывает о формах и методах привлечения рабочей силы в районы освоения целинных и залежных земель; четвертый включает документы об организации труда, быта и повседневной жизни переселенцев.

Иллюстративный блок включает 66 документов.

В издании представлены семь видеосюжетов из Белорусского государственного архива кинофотофонодокументов, в которых рассказывается о проводах студентов на целину, освоении целинных земель и уборке урожая, культурном досуге и возвращении целинников на родину.

## 9. Новая экономическая политика в БССР: сельское хозяйство

*Ответственный за выпуск Кулинок С. В.*




В электронном издании приводятся документы и материалы, отражающие новую экономическую политику в сельском хозяйстве на территории БССР. Представлены материалы и документы из фондов Национального архива Республики Беларусь и Государственного архива Минской области. Большинство из них публикуется впервые.

Среди опубликованных документов – законы, декреты, постановления, циркуляры, резолюции, протоколы и выписки из них, докладные записки, отчеты и др.

## КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
## выхаду ў свет інфармацыйных выданняў
## Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2022 г.

| № п/п | Выданне | Адказны за выпуск | Выхад у свет |
|---|---|---|---|
| | *ДРУКАВАНЫЯ* | | |
| 1 | Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 14 | Кірухіна Л.Г. | Лістапад |
| 2 | Бібліятэчны свет: часопіс | Кірухіна Л.Г. | 1 раз у 2 месяцы |
| 3 | Гісторыя беларускай нацыянальнай бібліяграфіі. 1921–2021 гг. | Кузьмініч Т.В. | Студзень |
| 4 | Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 25 | Шопіна М.М. | Снежань |
| 5 | Материалы IX Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» | Есіс Н.С. | Кастрычнік |
| 6 | Матэрыялы XVIII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў | Шопіна М.М. | Красавік |
| 7 | Новыя кнігі: па старонках беларускага друку | Градоўкіна І.У. | Кожны месяц |
| | *ЭЛЕКТРОННЫЯ* | | |
| 8 | Белорусы на целинных землях Казахстана: 1954 г. – середина 1960-х гг. | Кулинок С. В. | Сакавік |
| 9 | Новая экономическая политика в БССР: сельское хозяйство | Кулинок С. В. | Жнівень |